УДК 930:94:342(476)«1918»

**Р. Р. Лазько**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# АБ НЕАБХОДНЫХ ПАПРАЎКАХ У ГІСТАРЫЯГРАФІІ ПРАЦЭСУ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ НА ПАЧАТКУ НАВЕЙШАГА ЧАСУ

*Разглядаюцца існуючыя ў гістарыяграфіі неабгрунтаваныя ацэнкі асноўных падзей працэсу фарміравання беларускай дзяржаўнасці з канца 1917 да пачатку 1919 г., на аснове сістэмнага аналізу гістарычных крыніц прадстаўлены іх аўтарскія версіі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гісторыя станаўлення беларускай дзяржаўнасці на пачатку навейшага часу (тут мы абмяжоўваем перыяд датай абвяшчэння БССР) была адным з накірункаў беларускай гістарыяграфіі, які развіваўся надзвычай інтэнсіўна на працягу апошніх дзесяцігоддзяў, адказваючы на існаваўшы грамадскі запыт на адпаведныя даследаванні. Аднак даводзіцца з жалем канстатаваць, што нягледзячы на з'яўленне апошнім часам якасных манаграфічных даследаванняў [1; 2], у "масавым вымярэнні" ўсё яшчэ значнае месца ў гістарыяграфіі займае пераказ нічым не абгрунтаваных моўных штампаў і спекулятыўных заключэнняў, якія істотна спрашчаючых гістарычны працэс. Прычыны гэтай з'явы розныя, хоць пераважае інерцыя мыслення, няздольнасць, а то і нежаданне асобных аўтараў пераадолець уплывы аўтарытэтаў, якія ў свой час не мелі магчымасці сыйсці з пракрустава ложка ленінска- сталінскай ідэалогіі. У гэтым артыкуле мы спынімся на найбольш дакучлівых з ліку такіх штампаў, якія, па нашым перакананні, не толькі могуць, але і павінны быць адкінуты на аснове праведзеных даследаванняў па адпаведнай тэматыцы.

У межах вызначанага перыяду першым у ліку такіх штампаў варта паставіць тэзіс аб самастойнай ролі Саўнаркама Заходняй вобласці і фронту ў разгоне Усебеларускага з'езда, скліканне якога, як вядома, было падтрымана ленінскім Саўнаркамам. Прыхільнікі гэтага тэзісу, даверліва паставіўшыся да меркаванняў асобных мемуарыстаў, абыходзяць увагай такія "пытальнікі" прадмета свайго даследавання, як існаваўшая ў сістэме савецкай улады субардынацыя і прынцып дэмакратычнага цэнтралізму, які вызначаў арганізацыйную будову бальшавіцкай партыі. Хіба яны не дзейнічалі для Саўнаркама Заходняй вобласці і фронту і абласной партыйнай арганізацыі? Але найбольш вульгарны з абазначаных намі гістарычных штампаў, генетычна праросшы з ідэалагічнай барацьбы супраць "буржуазнага нацыяналізму" – гэта сцвярджэнне аб тым, што "народ не падтрымаў" Усебеларускі з'езд, сцвярджэнне, якое яго сённяшнія прыхільнікі прыводзяць без спасылкі хоць бы на якую– небудзь гістарычную крыніцу. Яно расцягваецца і на Беларускую Народную Рэспубліку (БНР), з той карэкціроўкай у некаторых аўтараў, што яе стваральнікі папракаюцца імі ў адыходзе ад рашэння Усебеларускага з'езда, у якім гаварылася аб аўтаномнай рэспубліцы ў складзе Расійскай Федэрацыі, а не аб самастойнай беларускай рэспубліцы. Працягваецца ідэалізацыя ўкладу ў абвяшчэнне Беларускай савецкай рэспублікі на мяжы 1918–1919 гг. Беларускага нацыянальнага камісарыята, якая сёння, ва ўмовах даступнасці адпаведных крыніц, выглядае анахранізмам [3, с. 108]. Гэта той мінімальны "набор" гістарыяграфічных ацэнак праблем станаўлення беларускай дзяржаўнасці, якія патрабуюць перагляду ў святле вынікаў навейшых даследаванняў.

Аргументацыю нашага закліку да такога наспеўшага перагляду лагічна будзе пачаць з пытання аб разгоне Усебеларускага з'езда як таго агульнанацыянальнага форума, на якім упершыню на практычны грунт была пастаўлена задача стварэння беларускай дзяржавы. Штампаванае ў шэрагу публікацый сцвярджэнне аб самастойнай і нават выключнай ролі Саўнаркама Заходняй вобласці і фронта ў правядзенні гэтай акцыі не абапіраецца на неабходнае вывучэнне крыніц *з улікам усяго гістарычнага кантэксту гэтай падзеі.* Уважлівы ўлік гэтага кантэксту прыводзіць да высновы, што разгон быў звязаны з канфліктам ленінскага Саўнаркама з Украінскай Народнай Рэспублікай (УНР), і толькі ў гэтай сувязі ён набывае рацыянальнае вымярэнне. 3 снежня Саўнаркам адным і тым жа дакументам прызнаў УНР і выставіў ёй ультыматум, у якім пагражаў "без усялякіх ваганняў" аб'явіць ёй вайну, калі яна на працягу 48 гадзін не прыме наступныя патрабаванні: не здымаць украінізаваныя часці войск з фронту; не прапускаць без згоды Вярхоўнага Галоўнакамандуючага праз сваю тэрыторыю вайсковыя часці на Дон, на Урал; даць згоду садзейнічаць барацьбе з контррэвалюцыяй на Доне і спыніць раззбройванне савецкіх часцей ва Украіне. 4 снежня ўльтыматум быў накіраваны Радзе. На наступны дзень Саўнаркам разгледзеў адказ на яго, прызнаў яго нездавальняючым і вырашыў, што Рада знаходзіцца ў стане вайны з Савецкай Расіяй [6, с. 7]. У гэты ж дзень Саўнаркам прызначыў наркама Ул. Антонава-Аўсеенку арганізатарам узброенай барацьбы супраць Рады.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У абстаноўцы расійска-украінскага кафлікту тэрыторыя Беларусі пераўтварылася ў важны плацдарм мабілізацыі і перамяшчэння сіл для барацьбы супраць украінскай Рады. Пасля размовы з Леніным Антонаў–Аўсеенка тэрмінова выехаў у Магілёў, дзе 7 снежня правёў нараду з кіраўнікамі Стаўкі і камандуючымі франтамі, на якой быў выпрацаваны план аперацыі. На гэтай нарадзе Мяснікоў адыграў выдатную ролю як галоўнакамандуючы Заходнім фронтам. Пазней гэта адзначыў Антонаў-Аўсеенка: “У Стаўцы дамовіўся з Мясніковым, – пісаў ён – што той выдзеліць адпаведныя сілы на гомельска-бахмачскі напрамак” [7, с. 50]. Гэта азначала – у раён Харкава, куды з Кіева адправіліся мясцовыя бальшавікі, каб стварыць там савецкі прарасійскі ўрад.

Адным з вынікаў нарады ў Стаўцы быў загад Глаўкаверха, у якім ён абвінаваціў Раду ў пераходзе на бок контррэвалюцыі і на гэтай падставе заклікаў “братоў-украінцаў” скінуць яе. Адначасова ён загадаў спыніць украінізацыю вайсковых часцей, а тым, якія ўжо ўкраінізаваліся, прадставіць на выбар: прызнаць уладу петраградскага Саўнаркама, адправіцца на фронт, або раззброіцца. Гэты ж ультыматум быў пастаўлены і ўсім існуючым у войску украінскім радам, якія падлягалі арышту, калі б адмовіліся прыняць яго [8, с. 262].

Такім чынам, рашэнне савецкага ўрада аб пераходзе да барацьбы з Украінскай Радай, падтрыманае рашэннямі Стаўкі, мела значэнне агульнага, а не толькі антыўкраінскага, павароту ў яго нацыянальнай палітыцы. Таму следам за сваім “антырадаўскім” загадам Крыленка выдаў дапаўненне да загаду № 12 ад 23 лістапада, у якім, спасылаючыся на дзеянні Рады, прыпыніў прадугледжаны тым загадам агульны працэс выдзялення нацыянальных часцей і забараніў нацыянальныя з’езды ў прыфрантавой паласе [9, с. 394, 471]. Праўда, кіраўнікі Заходняй вобласці і фронту не адважыліся даць гэтаму загаду зваротны ход і Усебеларускі з’езд працягваў працаваць. Але “дамоклаў меч” над ім быў занесены.

Вяртаючыся з нарады ў Стаўцы, Мяснікоў адправіў у Саўнаркам Заходняй вобласці і фронту тэлеграму, у якой патрабаваў прыняць рашучыя меры супраць франтавой і іншых украінскіх рад, устанавіць нагляд над штабам Першага польскага корпуса, спыніць арганізацыю нацыянальных палкоў і г. д. Змест гэтай тэлеграмы даўно вядомы даследчыкам па тэксту экстрэнна прынятай у яе духу пастановы Саўнаркама і прэзідыума Аблвыканзаха (хоць і датаванай публікатарамі памылкова). Мяркуем, што ў гэты ж час Мяснікоў адправіў з Магілёва яшчэ адну тэлеграму, вядомую толькі з газетнай публікацыі 1918 г., да нядаўняга часу недаступнай большасці гісторыкаў. Гэта была яго тэлеграма начальніку штаба Заходняга фронта па палітычнай частцы і начальніку Мінскага гарнізона П. М. Палукараву аб пазіцыі, якую належала заняць адносна Усебеларускага з’езда. Працытуем яе поўнасцю на рускай мове, маючы на ўвазе сэнсавыя разыходжанні адных і тых жа слоў у рускай і беларускай мовах. “Телеграмма. Западофронт. Полукарову. Сообщите товарищам, чтобы на съезде белоруссов Рады (відаць, “белорусской” – Р. Л.) они произвели переворот умов, раскол и выяснили буржуазность её. Это требуется. Главкозап Мясников” [10, с. 4].

Змест тэлеграмы дазваляе зразумець, што яе аўтар у момант яе падачы знаходзіўся пад свежым уражаннем ацэнкі ўкраінскай Рады, прагучаўшай на нарадзе ў Стаўцы, як арганізацыі буржуазнай, контррэвалюцыйнай. Для яго было ясна, што такой з’яўляецца і беларуская Рада, хоць яна яшчэ не выявіла гэтай сваёй сутнасці, вось таму і патрэбна было яе выкрыць. Пазней у такім выкрыцці ўжо не было неабходнасці, бо адхіліўшы кампрамісныя прапановы Саўнаркама ад 12 снежня [5, с. 11], Вялікая Беларуская Рада, усё кіраўніцтва з’езда, і нават яго левае крыло поўнасцю “выяснілі” сваю “буржуазнасць”. Гэты сэнс тэлеграмы Мяснікова Палукараву дазваляе датаваць яе вячэрнім часам 7 снежня, а першым яе вынікам, відаць, быў арышт у Мінску членаў украінскага франтавога камітэта, аб якім падымалася пытанне на Усебеларускім з’ездзе падчас выступлення камісара Саўнаркама С. Берсана.

Пасля вяртання Мяснікова са Стаўкі ў Мінск на працягу некалькіх дзён якраз і разгортваецца ліхаманкавая работа Саўнаркама, накіраваная на забеспячэнне перавароту ў свядомасці удзельнікаў з’езда (“переворот умов”) і дасягненне яго расколу. У святле вынікаў нарады ў Стаўцы з удзелам Мяснікова новае значэнне набывае дзейнасць на з’ездзе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“ўрадавага камісара” Усцінава, аб якой ён напісаў сам у розны час і ў розных варыянтах. У фальсіфікатарскім па змесце артыкуле, які быў апублікаваны ў “Советской правде” праз некалькі дзён пасля разгону Усебеларускага з’езда, побач з кпінамі на адрас з’езда ён прыводзіць і рацыянальную інфармацыю. Усцінаў апавядае пра тое, як, нацярпеўшыся пакут, стараючыся атрымаць мандат на з’езд, у чарговы раз пайшоў у яго мандатную камісію на плошчу Свабоды з пытаннем: “Буду я дапушчаны на з’езд ці не, бо мне неабходна было тады аб’явіць з’езду толькі што атрыманае распараджэнне Стаўкі”. Якое? Аб гэтым Усцінаў напісаў толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў для юбілейнага зборніка мемуараў. Аднак важнейшы раздзел яго ўспамінаў у зборнік не трапіў, затое яны захаваліся ў поўным выглядзе ў архіве. Усцінаў пісаў, што атрымаў ад Саўнаркама “тры мандаты: 1) пасведчанне, што я з’яўляюся ўрадавым камісарам; 2) загад зняць з парадку дня з’езда пытанне аб арганізацыі нацыянальнага войска; 3) загад аб закрыцці з’езда, калі пытанне аб войску не будзе знята з абмеркавання” [11, л. 8].

Супаставіўшы сведчанні Усцінава з вынікамі нарады ў Стаўцы, *прыходзім да адназначнай высновы аб тым, што прынцыповае рашэнне аб роспуску Усебеларускага з’езда было прынята бальшавіцкімі ўладамі Заходняй вобласці і фронту ўжо ў перыяд з 8 па 11 снежня,* падчас непрацяглага знаходжання Мяснікова ў Мінску, і яшчэ да чарговага яго ад’езду ў Стаўку 12 снежня [6, с. 8]. Пры такім разуменні сітуацыі ўстае на сваё месца і настойлівае сцвярджэнне Кнорына, запісанае ў 1925 г. [12, с. 231–232], што менавіта Мяснікоў спыніў існаваўшыя сярод бальшавіцкіх кіраўнікоў Заходняй вобласці і фронту ваганні наконт неабходнасці разгону Усебеларускага з’езда. Але рэалізавана гэта рашэнне было амаль што праз тыдзень, калі канчаткова высветліўся правал намаганняў раскалоць з’езд і быў здабыты праект яго рэзалюцыі. Хоць з’езд і выказваўся ў ёй за савецкую форму ўлады ў Беларусі, але за беларускія саветы, а створаныя бальшавікамі не прызнаваў.

Такім чынам, ёсць сур’ёзныя падставы для сцвярджэння аб тым, што Мяснікоў прывёз са Стаўкі калі не прамое распараджэнне ўрада аб роспуску Усебеларускага з’езда, то дазвол дзейнічаць адпаведна з сітуацыяй, якая будзе складвацца на з’ездзе, і з улікам неабходнай барацьбы з украінскай Радай. На карысць нашага сцвярджэння гавораць і некаторыя іншыя факты, акрамя прыведзеных, якія адлюстроўваюць тагачасную агульнарасійскую сітуацыю і ўплывалі на стаўленне ленінскага Саўнаркама да Усебеларускага з’езда. Звярнем увагу на падзеі, якія папярэднічалі перадачы Крыленкам вярхоўнага камандавання Мяснікову 12 снежня. Першая з іх – гэта размова Крыленкі па прамым провадзе з Саўнаркамам 11 снежня, у якой ён прадставіў Леніну інфармацыю па шэрагу пытанняў, у прыватнасці, далажыў аб ходзе аперацыі супраць Украінскай Цэнтральнай Рады [6, с. 9]. У кантэксце нашай тэмы важна адзначыць два аспекты размовы. Першы: Саўнаркам адобрыў рашэнне Крыленкі аб прыпыненні фарміравання на фронце нацыянальных часцей. Другі: Ленін патрабаваў прыняць самыя энергічныя меры, каб як можна хутчэй адправіць у раён Харкава “паболей цалкам надзейных войск, не спыняючыся пры гэтым ні перад якімі перашкодамі”. Ён жа даў згоду на прыезд Крыленкі ў Саўнаркам для вуснага даклада, але запатрабаваў перад ад’ездам перадаць яго рспараджэнне наконт адпраўкі войск у раён Харкава “найбольш энергічным людзям”. Відаць, Мяснікоў быў першым сярод такіх энергічных і заслугоўваўшых даверу людзей. Гэты факт неабходна адзначыць, перш за ўсё, як сведчанне таго, што Мяснікоў са сваімі партыйнамі таварышамі ў Заходняй вобласці і на фронце праводзілі палітыку цэнтральнага савецкага ўрада, а не сваю мясцовую – як у адносінах да Украіны, так і адносна Беларусі.

У сувязі з канфузам, напаткаўшым ленінскі Саўнаркам ў Украіне, дзе давялося перайсці да сілавых метадам барацьбы з УНР, пад прыкрыццём “другой”, савецкай, Украіны, ён быў вымушаны да апошняй магчымасці адцягваць пераход да такой жа канфрантацыі на беларускім геапалітычным полі. Іначай фіктыўнасць лозунга самавызначэння стала б занадта відавочнай, а прыватным вынікам такой сітуацыі было б выпадзенне з рук ленінскага Саўнаркама і ЦК бальшавіцкай партыі аднаго з аргументаў, накіраваных на падпарадкаванне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Устаноўчага сходу. Сталін прызнаваў у друку, што ён у тыя дні як наркам па справах нацыянальнасцей атрымліваў “мноства рэзалюцый і лістоў” ад украінцаў, аўтары якіх патрабавалі ад яго тлумачэння дзеянняў Савецкай Расіі адносна Украіны [13, с. 6]. На працягу снежня яму давялося неаднойчы публічна апраўдвацца ад імя ўрада, у тым ліку і на пасяджэнні УЦВК 14 снежня, перад абвінавачаннямі ў тым, што канфлікт узнік на грунце барацьбы ўкраінскага народа за самавызначэнне [13, с.15–16].

З улікам гэтай палітычна нявыгаднай для ленінскага ўрада сітуацыі, створанай канфліктам з УНР, ацэнім яшчэ адзін фрагмент выступлення Сталіна на пасяджэнні УЦВК (заўважым: усё яшчэ шматпартыйнага). Апраўдваючыся ад абвінавачанняў у правядзенні Саўнаркамам цэнтралісцкай палітыкі, Сталін сказаў: “Абласныя цэнтры, пабудаваныя па тыпу Савета Народных Камісараў (Сібір, Беларусія, Туркестан), звярталіся ў Савет Народных Камісараў за дырэктывамі. Савет Народных Камісараў адказаў: вы самі ўлада на месцах, таму самі павінны выпрацаваць дырэктывы…” [13, с. 16]. З кантэксту прамовы Сталіна вынікае, што абласныя савецкія цэнтры звярталіся да Саўнаркама за дырэктывамі, у тым ліку, па пытанні аб дапушчальнасці падзелу ўлады паміж буржуазіяй, з аднаго боку, пралетарыятам і сялянствам, з другога, як падзяліла яе, адпаведна з ацэнкай Сталіна, украінская Рада. А ў адказ ім паведамілі, што яны самі з’яўляюцца ўладай. Такімі выкрунтасамі Сталін запоўніў шэраг сваіх выступленняў па пытаннях нацыянальнай палітыкі ў канцы 1917 – пачатку 1918 г. Як іх зразумець у кантэксце беларускай палітыкі савецкага ўрада? Даволі проста. Не жадаючы пасля Украіны адкрыта выступіць у ролі душыцеля нацыянальнага самавызначэння яшчэ і ў Беларусі, калі б беларуская Рада вырашыла пайсці шляхам украінскай, ленінскі ўрад вырашыў схавацца за кулісамі. А кулісамі была быццам бы самастойная палітыка абласной савецкай улады. Мясцовым бальшавіцкім органам было даверана самім выбраць той момант, калі належала ўжыць сілу супраць нацыянальна-дзяржаўных намаганняў беларусаў.

Мы ўжо выказвалі думку пра тое, што *прынцыповае рашэнне*, якое развязвала рукі Саўнаркаму Заходняй вобласці і фронту для выкарыстання сілы супраць Усебеларускага з’езда, было прынятае неўзабаве пасля нарады ў Стаўцы і ў выніку гэтай нарады. Аднак прамая дырэктыва на гэты конт гісторыкам невядомая. Ці захавалася яна наогул? Прывядзем, аднак, тэлеграму старшыні абласнога Саўнаркама К. Ландара, у якой ён дакладваў цэнтральным уладам аб мерах, прынятых дзеля рэалізацыі пастаноў названай нарады. Тэлеграма пасылалася на два адрасы і, несумненна, прадугледжвала адказ Цэнтра (курсіў у публікацыі): “Стаўка. Глаўкаверх. Петраград. Урад Народных Камісараў. Украінская Рада Захфронта арыштаваная. *Паведаміце* [аб] *далейшым напрамку спраў і аб лёсе арыштаваных.* Украінскія эшалоны раззбройваюцца і накіроўваюцца ў тыл. *За астатнімі радамі* і Доўбарам [устаноўлены] *неаслабны нагляд*. Старшыня Абласнога Савета Народных Камісараў Ландар” [6, с. 10]. Адказ на прыведзены запыт нам, у прынцыпе, вядомы: ён прачытваецца ў разгоне Усебеларускага з’езда. Ці быў бы магчымы яго разгон, калі б ён не адпавядаў указанням ленінскага Саўнаркама аб“далейшым напрамку спраў”, аб якім запытваў Ландар? Вядома ж, не.

Калі ж звярнуцца да сцвярджэння аб тым, што “народ не падтрымаў” Усебеларускі з’езд, то яго прысутнасць у сучаснай гістарыяграфіі вызначаецца ўжо не толькі ідэалагічнай абмежаванасцю асобных аўтараў, інерцыяй мыслення іншых, але і ўплывам псіхалагічнага комплексу непаўнацэннасці, усё яшчэ ўласцівага шмат каму з беларусаў. Апошнія дзве прычыны, як можна заўважыць, нярэдка спалучаюцца ў падыходах аднаго і таго ж аўтара да адпаведнай праблематыкі. Такі “даследчык” цвёрда засвоіў (пераняў ад свайго настаўніка), што беларускі нацыянальны рух напярэдадні рэвалюцыі 1917 г. быў слабы, а беларускі народ інертны. “Мая хата з краю, мы людзі маленькія”. Для такога гісторыка з’яўляецца аксіёмай, што “маленькія людзі“ не маглі падтрымаць такую вялікую, рэвалюцыйную праграму, як перабудова Расіі ў федэратыўную дэмакратычную дзяржаву ў выніку руху недзяржаўных народаў. На самай жа справе інертны ён сам. А пры большай адказнасці і свежасці мыслення,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грунтуючыся на дастатковым веданні адпаведных крыніц, прафесійны гісторык здольны прыйсці да разумення, што беларускі нацыянальны рух у гады Першай сусветнай вайны перажываў незвычайны перыяд у сваім развіцці, перыяд дыялектычнага скачка, фарміравання ў ім новых якасцей. Ён развіваўся ва ўмовах паскараўшага гэты рух сусветнага цывілізацыйнага крызісу, набыўшага ў Расіі найбольш глыбокі і драматычны характар.

У канцы 1917 г. ва ўмовах сістэмнага расійскага крызісу ўпершыню за многія гады гістарычны працэс накрэсліў перад беларускім народам асобны ад расійскага варыянт гістарычнага развіцця. Узнікшая сітуацыя ўжо вызначана беларускім гісторыкам як “час выбару” [14], і да гэтай слушнай ацэнкі застаецца толькі дадаць, што працэс гістарычнага выбару беларусаў набыў хвалепадобны, дыскрэтны характар, і зацягнуўся на некалькі год. Але першы яго этап абмежаваны рубяжом 1917–1918 гг. Асмелімся сцвярджаць, што на гэтым рубяжы сусветная вайна, якая стала трагедыяй для беларускага народа, набыла характар *аптымістычнай трагедыі* [15]. Узнікла не толькі неабходнасць, але і прынцыповая ажыццявімасць для беларускага народа гістарычнага рыўка ад стану “рэчы ў сабе” да стану гаспадара свайго краю і свайго лёсу ў ім.

Сфармуляваўшы гэтыя пастулаты, вернемся да пытання аб падтрымцы (ці непадтрымцы?) беларускім народам (nota bene!) *Усебеларускага* з’езда. Ён, як вядома, пачаўся 5 снежня, хоць афіцыйнае яго адкрыццё адбылося 7 снежня, калі з’ехаліся 500 дэлегатаў з вырашальным голасам і 200 – з дарадчым. Усяго ж да 17 снежня мандатная камісія выдала 1872 мандаты, з якіх 1167 – дэлегатам з вырашальным голасам і 705 – з дарадчым. Гэтыя лічбы абапіраюцца на сведчанні кіруючых асоб з’езда, у прыватнасці, старшыні мандатнай камісіі П. Крачэўскага, і таму набылі шырокае прызнанне гісторыкаў. Разам з тым, самое параўнанне прадстаўленых лічбаў дазваляе зразумець, што колькасны склад дэлегатаў з’езда на працягу яго працы не быў стабільным. Акрамя аб’ектыўных прычын недастатковай яўкі на з’езд у першыя яго дні, выкліканых разрухай у краі, на гэта паўплывалі і амбіцыі кіраўніцтва Беларускага абласнога камітэта (БАК), якое заклікала беларускія арганізацыі на 5 снежня ў Мінск не выязджаць, а з’явіцца толькі 15 снежня. Аб’ектыўна гэта была дэзарганізатарская пазіцыя. Аднак ні аб’ектыўныя, ні суб’ектыўныя прычыны не здолелі істотна знізіць прадстаўнічасць гэтага агульнабеларускага форуму.

Гэта ацэнка будзе тым больш пераканаўчай, калі мы заўважым, што восенью 1917 г. рознага роду выбары і з’езды ішлі адзін за другім, а то і супадаючы ў часе. Адбывалася пакутлівае пераўтварэнне мас людзей з аб’екта палітыкі ў яе суб’ект. У гэтым патоку палітызацыі насельніцтва ішло выдзяленне і пашырэнне беларускай нацыянальнай плыні. Параўнанне колькасных параметраў Усебеларускага з’езда з такімі ж параметрамі іншых з’ездаў, што ўтваралі гэты паток, дасць нам лепшае ўсведамленне працэсу фарміравання ў ім гэтай плыні [5, с. 7]. Мэтазгодна ўзяць для параўнання тыя *тры з’езды,* якія мінскія бальшавікі правялі з мэтаю легалізацыі сваёй улады ў краі і адначасова дзеля ўмацавання ўладных пазіцый напярэдадні выбараў ва Устаноўчы сход. Першы з гэтых з’ездаў – 3–ці з’езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай гберняў – праходзіў 18–20 лістапада. Адпаведна з паведамленнем газеты “Звезда”, адна з пастаноў з’езда зафіксавала лічбу ў 335 яго ўдзельнікаў. 20–25 лістапада прайшоў 2 з’езд армій Заходняга фронта, які быў больш прадстаўнічым, што і зразумела, паколькі менавіта салдаты фронту былі галоўнай апорай бальшавікоў у краі. У дзень яго адкрыцця на з’ездзе прысутнічала 450–500 чалавек, у наступныя дні, калі меркаваць па справаздачы той жа “Звезды”, колькасць яго ўдзельнікаў вагалася ад 310 да 633 чалавек. Відавочна, салдаты–дэпутаты аказаліся не надта дысцыплінаванымі. Але найбольшы клопат мінскія бальшавікі мелі са з’ездам саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці. “Звезда” не здолела назваць колькасць яго ўдзельнікаў, былі пералічаны толькі прадстаўленыя на з’ездзе саветы, якіх аказалася 16. Гэта была прыкладна трэцяя частка ўсіх існаваўшых у Беларусі на момант бальшавіцкага перавароту саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў разам з агульнымі саветамі рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Бальшавікам на з’ездзе быццам бы належала дзве трэці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

месц, астатнія – левым эсэрам. *Выходзіць, што Усебеларускі з’езд у першыя дні сваёй працы па колькасных паказчыках пераўзыходзіў скліканы бальшавікамі сялянскі з’езд і быў блізкі да франтавога з’езда, а ў апошнія дні працы пераўзыходзіў усе тры гэтыя з’езды.* Што датычыць тэрытарыяльнага і сацыяльнага прадстаўніцтва, то з’езд меў поўнае права назваць сябе ўсебеларускім, бо прадстаўляў усе рэгіёны Беларусі, у тым ліку дзякуючы ўдзелу бежанцаў – і акупаваную заходнюю частку краю, а таксама і ўсе яго сацыяльныя слаі. У адрозненне ад асобных сучасных аўтараў, мінскія бальшавікі, якія не толькі назіралі за з’ездам, але і былі прадстаўлены на ім, ведалі аб яго прадстаўнічым і народным характары і адзначалі ў сваім друку, што “ў працы беларускага з’езда запрошаны прыняць удзел усе партыі і прадстаўніцтвы ў Беларусі без выключэння”, і што з’езд сабраўся “шматлюдны”, “настрой [на ім] узняты” [16]. Дык гэта сведчыць аб непадтрымцы народам з’езда яго прадстаўнікоў? Ці наадварот?

Варта звярнуць увагу на яшчэ адну акалічнасць, звязаную з Усебеларускім з’ездам, – на той гістарычны момант, калі беларускія арганізацыі выбіралі сваіх дэлегатаў на з’езд, і на тыя лозунгі, пад якімі выбары праводзіліся. Яны праходзілі літаральна назаўтра пасля выбараў ва Ўстаноўчы сход, з якімі масы людзей на працягу некалькіх месяцаў звязвалі свае спадзяванні на замацаванне ў законах ужо праведзеных рэвалюцыйных пераўтварэнняў, у прыватнасці перадачы зямлі зямельным камітэтам для яе раздзелу паміж сялянамі, і іншых. Здавалася б, што яшчэ можна было выбіраць? Тым не менш, многія тысячы людзей, прадстаўленыя ў сялянскіх саветах, гарадскіх і земскіх самакіраваннях, беларускіх радах у войску не палічылі лішнімі выбары на беларускі з’езд, папярэдняя праграма якога была намечана ў звароце да гэтых арганізацый Вялікай Беларускай Рады ад 18 лістапада 1917 г. “З’езд гэты павінен выявіць волю народа беларускага, які не можа і не жадае далей абыякава адносіцца да свайго лёсу у цяперашні небяспечны і адказны момант. З’езд павінен абмеркаваць і вызначыць усе магчымасці самаабароны шматпакутнага беларускага народа і прыняць меры для яе самаарганізацыі”, – гаварылася ў звароце. Выбаршчыкі галасавалі за ўдзел у з’ездзе, на парадак дня якога прапанаваліся наступныя пытанні: “1. Міжнароднае становішча Беларусі (вайна і мір). 2. Зямельнае пытанне. 3. Будучае палітычнае ўладкаванне Беларусі. 4. Стварэнне органа краёвай улады” [5, с. 8]. *Такім чынам, дэлегаты з’езда адпраўляліся ў Мінск, усведамляючы свае задачы як паўнамоцных прадстаўнікоў беларускага народа*, а найбольш дасведчаныя з іх глядзелі на маючы адбыцца з’езд як на Беларускі Ўстаноўчы сход (ці Ўстаноўчы сойм).

Менавіта гэта настроенасць розных слаёў беларускага народа на тое, каб узяць ва ўласныя рукі лёс свайго краю, склала асноўны аптымістычны кампанент трагедыі сусветнай вайны ў Беларусі. Асобна варта выдзяліць у якасці такога яе кампанента эвалюцыю свядомасці беларускага сялянства ў нацыянальным духу, у духу “будаўніцтва сваёй хаты”, што ўпершыню ў гісторыі адкрывала перспектыву пераўтварэння беларускага руху ў масавы. Хоць на Усебеларукім з’ездзе сяляне займалі найбольш памяркоўную і няўстойлівую пазіцыю, але здзіўляе не гэта. Уражвае іх масавы ўдзел у гэтым *нацыянальным* форуме, што яшчэ за паўгода да з’езда немагчыма было ўявіць. Заўважым у гэтай сувязі, што на скліканы Беларускім камітэтам агульнакраёвы сялянскі з’езд у красавіку 1917 г. з’явіліся толькі 52 дэлегаты, а на Мінскім губернскім, які ў тым жа месяцы правялі бальшавікі, было прадстаўлена звыш 800 дэлегатаў ад сялян, і прайшоў ён у антыбеларускім духу[14,с. 125–127].

Разам з тым, канстатуючы эвалюцыю сялянства на нацыянальныя пазіцыі, неабходна ўсведамляць, што і ў той час, і на працягу наступных некалькіх год яна стрымлівалася істотнымі аб’ектыўнымі фактарамі. Гэта эвалюцыя ішла двума геаграфічна аддзеленымі адзін ад другога патокамі – бежанскім і мясцовым – і адчувала на сабе ўплыў незавершанай барацьбы сялян за зямлю. Павольнае злучэнне двух патокаў у адзін пачалося пасля падпісання Савецкай Расіяй і Германіяй Брэсцкага міру, калі пачалі вяртацца ў Беларусь бежанцы з Расіі. Аднак праз кароткі час пасля завяршэння Першай сусветнай вайны Беларусь была зноў падзелена, на гэты раз фронтам польска-савецкай вайны, і кожны паварот польска-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

савецкай барацьбы зноў абвастраў зямельнае пытанне для беларускага селяніна. Аднак выпрацаванае ім да канца 1917 г. усведамленне аб "чужаніцах", на якіх нельга спадзявацца, уладкоўваючы сваё жыццё, з таго часу моцна засела ў яго свядомасці і ўплывала на яго паводзіны. Падчас нямецкай, а затым і польскай акупацыі гэта ўсведамленне вяло сялян у "зялёнае войска", на яго абапіраліся як беларускія эсэры, так і мясцовыя камуністы з–пад шыльды Кампартыі Літвы і Заходняй Беларусі. Яно ж несла надзею і маладым беларускім нацыянал–камуністам з асяроддзя Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый, створаных у Расіі на працягу 1918 г., ратуючы іх ад пераўтварэння ў групкі палітычных маргіналаў, што згубіліся ў водавароце грамадзянскай вайны.

Тут якраз мы падыйшлі да чарговага, перажыўшага свой час штампа, у якім шэраг беларускіх гісторыкаў, паддаючыся эмоцыям, звязваюць з'яўленне БССР з актыўным націскам на цэнтральныя савецкія ўлады з боку таго самага Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый у РКП(б). Маўляў, дабіваліся гэтай мэты амаль на працягу года, пераконвалі цэнтральныя ўлады, і раптам вырашылі задачу на працягу некалькіх дзён. Гэта вельмі наіўная версія, і яна сведчыць аб павярхоўным стаўленні яе прыхільнікаў да адпаведных крыніц, аб іх *ментальнай* няздольнасці прыняць заключаную ў іх суровую праўду. Беларускія нацыянал–камуністычныя арганізацыі ў Расіі на самай справе не мелі такой сілы, каб аказаць эфектыўны націск на маскоўскія ўладныя цэнтры. Наадварот, яны адчувалі пэўную сваю адарванасць ад краю ва ўмовах яго акупацыі, бачылі варожае стаўленне да сябе з боку бальшавіцкіх уладаў Заходняй вобласці і недавер з боку савецкіх кіруючых інстанцый, і ў такіх умовах выступалі перад гэтымі інстанцыямі ў ролі сціплых просьбітаў, не адважваючыся пайсці далей пастулата аб утварэнні Беларускай савецкай аўтаномнай рэспублікі ў складзе РСФСР. Але і яе стварэнне яны звязвалі з працяглай падрыхтоўчай работай у вызваленай Беларусі, якая мусіла б завяршыцца скліканнем Усебеларускага камуністычнага з'езда. У гэтым духу праходзіла канферэнцыя беларускіх камуністычных секцый у Маскве 21–23 снежня, пратакол якой апублікаваны [17 ], але на вывучэнне якога ў сучасных прыхільнікаў беларускага нацыянал–камунізму, відавочна, не хапае ні часу, ні сіл. А калі б яны прачыталі яго, то напэўна б заўважылі, што ўдзельнікі канферэнцыі, паставіўшы ў прынятай рэзалюцыі пытанне аб стварэнні ў Беларусі работніцка-сялянскага ўрада, нават не вынеслі яго на абмеркаванне Белнацкама, урадавай структуры, чарговае пасяджэнне якой адбылося ўдзень 25 снежня. Белнацкм задаволіўся толькі "прыняццем да ведама" пастановы канферэнцыі [18, л. 86].

Для беларускіх нацыянал–камуністаў было вялікай нечаканасцю, калі праз суткі пасля завяршэння іх канферэнцыі за стварэнне Беларускай савецкай рэспублікі ўзяўся наркам Сталін. Ён узяўся за гэтую справу, нягледзячы на тое, што яшчэ ўвечары 23 снежня, маючы такую нагоду, ні словам не ўпамянуў аб магчымасці стварэння Беларускай рэспублікі ў бліжэйшы час. У гэты вечар Сталін зрабіў даклад ад імя Саўнаркама на пасяджэнні Усерасійскага ЦВК саветаў "Об отношении к вновь образовавшимся республикам: Эстонской, Латышской и другим". У гэтым дакладзе наркам прадставіў на зацвярджэнне УЦВК рашэнне СНК аб прызнанні трох савецкіх рэспублік у Прыбалтыцы, матывуючы яго неабходнасцю аднаўлення адзінства Савецкай Расіі і яе моцы, ва ўмовах, калі іншых рэальных шляхоў для гэтага не засталося. Ні ў яго дакладзе, ні ў праекце рэзалюцыі, ні ў самой рэзалюцыі Беларусь не ўпаміналася [19, л. 1–52, 160].

Тым не менш, роўна праз суткі, за некалькі хвілін да поўначы, Сталін паслаў у Смаленск, Абласному Выканаўчаму камітэту Заходняй вобласці, тэлеграму, у якой выклікаў Мяснікова на размову па прамым провадзе на 3 гадзіны дня 25 снежня. У гэтай размове ён паведаміў аб рашэнні ЦК партыі "па шматлікіх меркаваннях згадзіцца з беларускімі таварышамі" і стварыць Беларускую савецкую рэспубліку.

Пратакол з рашэннем ЦК па гэтым пытанні гісторыкамі да гэтага часу не знойдзены, што прымушае іх спекуляваць як наконт даты яго прыняцця, так і наконт яго матываў. У нас нават ёсць падставы сумнявацца, што Сталін, гаворачы аб "беларускіх таварышах", меў на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўвазе удзельнікаў канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый, якая толькі што завяршылася. Наўрад ці быў ён знаёмы з яе пратаколам к канцу дня 24 снежня, калі выклікаў Мяснікова для размовы на наступны дзень. Сумнявацца ў гэтым прымушае вывучэнне архіўнага дакумента, на які спасылаліся беларускія гісторыкі як на сведчанне ўважлівага стаўлення ЦК РКП(б) да канферэнцыі беларускіх камуністаў і яго неадкладнай рэакцыі на яе пастановы [20, с. 71; 21, с. 99]. Высвяляецца, што тут мы маем справу з занадта вольнай трактоўкай гэтага дакумента адным аўтарам і даверлівым стаўленнем да свайго калегі з боку іншага. Глянем яго і мы. Дакумент уяўляе сабой машынапісны тэкст без даты і подпісу [22, л. 174], які пазней быў апублікаваны і даціраваны публікатарамі "не раней 27 снежня" [23, с. 77, 310] на аснове інфармацыі, узятай з іншага дакумента Сакратарыята ЦК РКП(б). Кароткі адказ на запыт Сакратарыята Маскоўская беларуская секцыя РКП(б) дала 28 снежня, у ЦК РКП(б) ён быў атрыманы 2 студзеня, а дакументы канферэнцыі – пратакол, рэзалюцыі, паіменны спіс удзельнікаў – былі адпраўлены толькі 17 студзеня, а атрыманы 20 студзеня 1919 г. [23, с. 195 196].

Наогул маскоўскія партыйныя ўстановы не праявілі цікавасці да канфэрэнцыі беларускіх камуністычных секцый, хоць яна і спрабавала звярнуць на сябе ўвагу, паслаўшы ў дзень свайго адкрыцця прывітанні ў адрас персанальна Леніна, Сталіна, а таксама Рэвваенсавета Рэспублікі і Усерасійскага ЦВК саветаў. Аб гэтым сведчыць яе пратакол і перапіска Маскоўскай секцыі беларускіх камуністаў з Сакратарыятам ЦК РКП(б). Ні адна з маскоўскіх партыйных уладаў не паслала на канферэнцыю свайго прадстаўніка, а "Правда", цэнтральны друкаваны партыйны орган, адгукнулася на яе толькі 26 снежня, праз тры дні пасля завяршэння канферэнцыі. Прычым, змест яе водгуку дазваляе зразумець, якое нязначнае месца займала да таго часу беларускае пытанне ў палітыцы партыі і савецкага ўрада. Інфармацыя была пададзена ў невялічкай заметачцы аб'ёмам у 42 радкі ў адну калонку пад рубрыкай "Партыйнае жыццё" на апошняй старонцы газеты. Важна і тое, *што* ўбачыла "Правда" ў дыскусіях і пастановах канферэнцыі, *што* яна акцэнтавала ў іх. З прагучаўшых дакладаў "выяснілася, – пісала газета, – што ў самой Беларусіі справа новага савецкага будаўніцтва і партыйнай работы стаіць далёка не на адпаведнай вышыні па прычыне адсутнасці актыўных сіл. Таму канферэнцыя прыйшла да пераканання, што неабходна ўсе сілы беларусаў–камуністаў, якія знаходзяцца ў Савецкай Расіі, направіць у гушчыню народных працоўных масаў Беларусіі". І гэта была ўся заметка. Як можна пераканацца, галоўны партыйны орган, рупар ЦК, не заўважыў у працах канферэнцыі пастаноўкі беларускімі камуністамі пытання аб беларускай савецкай дзяржаўнасці. Таму сёння, ва ўмовах лепшага крыніцавага забеспячэння даследавання гэтай праблемы, недарэчна паўтараць недахопы прац нашых папярэднікаў, меўшых у значнай ступені аб'ектыўны характар.

Мяркуем, што "беларускія таварышы" ў лексіконе Сталіна абазначалі зборны вобраз, які ўключаў і "маскоўскіх" беларусаў, і тых, з якімі кантактаваў старшыня Мінскага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта І. Рэйнгольд, калі 10 снежня з'явіўся ў пакінуты немцамі Мінск. Менавіта ў ходзе яго мінскіх кантактаў у першыя дні пасля вызвалення набыла канкрэтнае выражэнне ідэя аб стварэнні Літоўска-Беларускай савецкай рэспублікі, якую Рэйнгольд 20 снежня пераадрасаваў Свярдлову, не знайшоўшы падтрымкі ёй у кіраўніцтва Заходняй камуны [24, л. 13; 25, л. 13–15]. Разглядаючы яе ў кантэксце падзей, якія неўзабаве разгарнуліся на беларускім геапалітычным полі, мы зразумеем, што яна аказалася вельмі своечасовай для бальшавіцкіх цэнтральных уладаў.

Ідэнтыфікуючы "беларускіх таварышаў" у сталінскім паведамленні Мяснікову, мы не можам абысціся без сведчанняў адной з цэнтральных фігур у тых падзеях, што прывялі да абвяшчэння БССР – былога кіраўніка Белнацкама і старшыні Цэнтральнага бюро беларускіх камуністычных секцый Зміцера Жылуновіча. Вось што напісаў ён праз 10 год пасля канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый: частка яе дэлегатаў "не паспела яшчэ пакінуць Масквы, як важнейшае пытанне канферэнцыі – стварэнне беларускага рабоча-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сялянскага ўрада – было вырашана” [26, с. 93]. Зміцер Жылуновіч, чалавек амбіцыйны, не здолеў прызнацца, што Цэнтральнаму бюро ў гэтай сітуацыі дасталася толькі пасіўная роля адрасата прапановы, якую яму зрабіў Сталін, выступаўшы ад імя ЦК партыі. Але ў нас ёсць больш надзейныя крыніцы, у прыватнасці, копія пратакола экстрэннага пасяджэння калегіі Белнацкама сумесна з прадстаўнікамі ЦБ беларускіх камуністычных секцый і Маскоўскай секцыі, склiканага Жылуновічам увечары 25 снежня менавіта дзеля таго, каб паведаміць аб выніках размовы са Сталіным. Заўважым: для калегіі Белнацкама гэта было другое за дзень пасяджэнне: на першым, звычайным, Жылуновіч далажыў аб пастанове канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый, якая была “прынята да ведама”. Затым было вырашана прасіць Наркамнац зацвердзіць яго загадчыкам Белнацкама. Аб утварэнні Беларускай савецкай рэспублікі на гэтым пасяджэнні гаворка не вялася [27, л. 86]. А вось на вячэрнім пасяджэнні ўжо было прадстаўлена рашэнне савецкага кіраўніцтва па гэтым пытанні як надзвычайнае і неадкладнае даручэнне: “Таварыш Жылуновіч паведаміў сходу аб тым, што сёння народны камісар па справах нацыянальнасцей таварыш Сталін, запрасіўшы да сябе па тэлефоне адказных супрацоўнікаў Беларускага нацыянальнага камісарыята, узняў пытанне аб дзяржаўным уладкаванні Беларусі. З абмену думкамі выяснілася, – пераказваў далей Жылуновіч, – што, маючы на ўвазе (“в виду”) сучасныя міжнародныя адносіны і з мэтай умацавання і расшырэння заваёў сацыялізму ў сусветным маштабе, у сённяшні момант цалкам наспела неабходнасць аб’яўлення Беларусі, як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі, незалежнай сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай“ [28, л. 21] .

Важна падкрэсліць некалькі істотных дэталяў гэтай сустрэчы, першая: прадстаўнікоў Белнацкама паклікаў на размову Сталін; другая: менавіта ён узняў пытанне аб стварэнні Беларускай савецкай рэспублікі, а не яго суразмоўцы (хоць і не ставіў яго ў дырэктыўным ключы); трэцяя: ён зрабіў гэта пасля таго, як абмеркаваў адпаведнае пытанне з Мясніковым, кіраўніком абкама, засведчыўшы тым самым, які орган з’яўляецца рэальным праваднiком палітыкі ЦК РКП(б) у Беларусі. Нарэшце, крыніцы ўказваюць на яшчэ адзін важны момант размовы прадстаўнікоў Белнацкама са Сталіным, пакінуты гісторыкамі без увагі: выясняецца, што, пачуўшы паведамленне наркама аб рашэнні стварыць Беларускую савецкую рэспубліку, запрошаныя беларусы пачалі спрачацца паміж сабой, ці варта гэта рабіць? Цвёрдую і станоўчую пазіцыю па гэтым пытанні заняў Жылуновіч. Узнікшую падчас размовы сітуацыю рэалістычна ўзнаўляюць яго паказанні Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б, дадзеныя 30 студзеня 1931 г., калі над яго галавой ужо сабраліся хмары рэпрэсій “за нацыялістычнае супраціўленне” лініі партыі. Вось іх фрагмент, зафіксаваны ў стэнаграме: “Когда мы явились к товарищу Сталину, товарищ Сталин сказал – нужно или не нужно, по нашему мнению, провозгласить республику. Я, несмотря на то, что те, которые были со мной, говорили, что мы не думаем, чтобы можно было…, тогда я говорю т. Сталину, что я беру на себя всё это» [29, л. 199]. Хоць гэтыя паказанні выглядаюць толькі спробай ўратавацца чалавека, трапіўшага ў трагічную сітуацыю, але, тым не менш, з’яўляюцца праўдзівымі. Іх праўдзівасць пацвярджаецца, у прыватнасці, сведчаннямі А. Чарвякова, пачутымі Ул. Дубоўкам на пачатку 1921 г. [30, с. 79], а ў інфармаванасці Чарвякова не даводзіцца сумнявацца.

Цяжка сабе ўявіць, як бы складваліся падзеі далей, калі б на сустрэчы Сталіна з прадстаўнікамі Белнацкама перамагла пазіцыя, вызначаная на канферэнцыі беларускіх камуністычных секцый, адпаведна якой БССР павінна была з’явіцца вынікам натуральнага і працяглага працэсу нараджэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. Сярод мноства ўвасабленняў такой нерэалістычнай у тых умовах альтэрнатывы можна было б мадэліраваць новы перанос Мясніковым абласной партыйнай канферэнцыі, адмену яго і Калмановіча паездкі ў Маскву па выкліку Сталіна і г. д.

Але паездка Мяснікова з Калмановічам адбылася, як і было дамоўлена, 27 снежня, праз 2 дні пасля размовы Сталіна з прадстаўнікамі Белнацкама. Ад сустрэчы з беларусамі гэтая другая прынцыпова адрознівалася тым, што была дзелавой сустрэчай аднадумцаў, на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якой былі адкрыты планы ЦК РКП(б) наконт Беларусі і выдадзены адпаведныя інструкцыі для іх рэалізацыі. Гэтыя інструкцыі пазней былі названыя савецкімі гісторыкамі “Шэсць умоў таварыша Сталіна па стварэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі і Кампартыі Беларусі”. Яны прадугледжвалі наступнае: 1) урад будучай рэспублікі будзе складацца са старшыні і 15 членаў; 2) бягучымі справамі будзе займацца прэзідыум урада ў колькасці 3 чалавек;
3) тэрыторыя Рэспублікі будзе ўключаць губерні Гродзенскую, Мінскую, Магілёўскую, Віцебскую і Смаленскую (апошнюю са згоды “мясцовых таварышаў”); 4) Паўночна-Заходні абкам партыі пераўтвараўся ў Цэнтральнае Бюро КП(б) Беларускай Рэспублікі; 5) старшыня Цэнтральнага Бюро будзе прадстаўнікам ЦК РКП(б) і цэнтральнага ўрада; 6) правы Цэнтральнага Бюро партыі і аддзелаў рэспубліканскага ўрада застануцца такімі ж, як абкама і Аблвыканкамзаха [31, с. 61–62] .

Відавочна, што шэраг намечаных “умоў” былі непрымальнымі для беларускіх нацыянал–камуністаў, як, напрыклад, аб тэрыторыі Рэспублікі, і асабліва аб фарміраванні і паўнамоцтвах яе органаў улады, сярод якіх кіруючае месца адводзілася быломў абкаму партыі, вядомаму сваёй антыбеларускай палітыкай. Але наўрад ці Сталін абмежаваўся толькі гэтымі палажэннямі. Відавочна, на сустрэчы са сваімі партыйнымі таварышамі з “Заходняй Камуны” ён не ўтойваў матываў раптоўнага рашэння ЦК РКП(б) аб стварэнні Беларускай савецкай рэспублікі. Аб гэтым можна меркаваць як на аснове некаторых дакументальных крыніц, так і па публікацыях савецкага друку таго часу, прысвечаных беларускай тэме. Шмат што можна зразумець, перачытваючы даклад Мяснікова на VI абласной партыйнай канферэнцыі, зроблены, падкрэслім, праз тры дні пасля яго і Калмановіча сустрэчы са Сталіным. Галоўная ідэя сярод матываў рашэння ЦК – гэта ідэя аб неабходнасці супрацьпаставіць “буржуазнаму” самавызначэнню самавызначэнне працоўных, але ў нацыянальнай форме, і ў выніку не дапусціць “акружэння Савецкай Расіі сусветным капіталам”, як гаварыў Мяснікоў у сваім дакладзе. Ён называў тут Польшчу і Украіну як тыя дзве суседнія дзяржавы, стварэнне якіх з’яўляецца праявай “тонкай палітыкі Антанты”, накіраванай на акружэнне Савецкай Расіі. Асабліва выдзяліў ролю Польшчы як “жандармерыю Антанты супраць Савецкай Расіі і плаціну супраць распаўсюджвання бальшавізму”. Можна заўважыць, што Мяснікоў у гэтым дакладзе на партыйнай канферэнцыі, абвясціўшай сябе з’ездам Кампартыі Беларусі, нават паўтарыў сталінскі выраз аб “средостении” з нацыянальна-буржуазных дзяржаў, якое “неабходна пераадолець… на шляху ў Заходнюю Еўропу і, галоўным чынам, да нашай сувязі з Германіяй”. Вось таму “Заходняя Камуна павінна аб’явіць сябе самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай” [32, с. 14, 15] .

Такім чынам, прадстаўленая Мясніковым матывіроўка рашэння аб стварэнні Беларускай савецкай рэспублікі, – відавочна, вынесеная з кабінета Сталіна, – з аднаго боку, сведчыла пра тое, што агульная стратэгія бальшавіцкага кіраўніцтва на заходнім палітычным накірунку не змянілася – ёю была нацэленасць на рэвалюцыю ў Еўропе – але мянялася тактыка дасягнення гэтай мэты. К сярэдзіне трэцяй дэкады снежня стала зразумелым, што прайсці ў Еўропу “беларускім калідорам”, за плячыма адыходзіўшых нямецкіх войск, па шэрагу прычын не ўдасца, у тым ліку і таму, што на шляху з’явілася польская “плаціна”. Але калі б і ўдалося прайсці ў абход гэтай “плаціны”, у накірунку на Усходнюю Прусію, то сам гэты паход губляў на той момант сэнс у сувязі са спадам рэвалюцыйнай хвалі і ростам антыбальшавіцкіх настрояў у Германіі. Ва ўзнікшай сітуацыі сама Заходняя вобласць, як сказаў Мяснікоў, станавілася небяспечным праходам для сіл “Чорнага Інтэрнацыянала”. Яго неабходна было закрыць, каб пазней адкрыць зноў, але, натуральна, для сіл “чырвонага”, Камуністычнага Інтэрнацыянала. Яго стварэнне па ініцыятыве Леніна якраз пачалося ў тыя ж самыя дні, калі было прынята рашэнне аб стварэнні Беларускай савецкай рэспублікі.

Але якім жа спосабам ленінскі ўрад здольны быў закрыць беларускі праход, ды так, каб пакінуць ключ ад яго ва ўласных руках? Калісці класікі даследавання гэтай тэмы ў беларускай гістарыяграфіі, знаёмыя з адпаведнымі партыйнымі дакументамі, увялі ва ўжытак

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэрмін “буферная рэспубліка”, будучы вымушанымі карыстацца эзопаўскай мовай дзеля яго тлумачэння. Маўляў, БССР як “буферная рэспубліка”, закрые гэты праход. А на мяжы савецкай эпохі акадэмік Ігнаценка ўжо адкрыта напісаў, як ён разумеў ролю беларускай “буфернай” рэспублікі пры закрыванні прахода для “чорнага” Інтэрнацыянала, у якасці авангарда якога, на яго думку, выступіла Польшча. “Абвяшчэнне БССР…, – пісаў ён, – было прадыктавана неабходнасцю абароны перамогшай у Расіі Кастрычніцкай рэвалюцыі, абароны яе любой цаной – нават стратай некаторай часткі тэрыторыі, калі спатрэбіцца” [33, с. 185]. Далей акадэмік указваў на пазнейшую саступку Польшчы Савецкай Расіяй Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны як на такую ўратавальную страту. Аднак адэпты масцітага гісторыка, не валодаючы і блізка ўласцівай яму крэатыўнасцю, не ўбачылі зробленай ім падказкі і не здолелі да сёння развіць гэты тэзіс.

Між тым, Беларуская савецкая рэспубліка не мела ніякіх магчымасцей, каб стаць ваенна-палітычным бар’ерам перад польскай экспансіяй, ні ваенна-матэрыяльных, ні маральных, ні якіх–небудзь іншых… – за выключэннем аднаго: нежадання беларускіх сялян, каб памешчыкі вярнуліся на іх зямлю. Буфернасць Беларускай савецкай рэспублікі выяўлялася ў яе поўнай палітычнай залежнасці, у яе здольнасці служыць дыпламатычным інструментам РСФСР у адносінах з Польшчай, якая рыхтавалася пачаць сваю тэрытарыяльную экспансію на ўсход. Польская экспансія ўяўляла сабой непасрэдную пагрозу для савецкай улады на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, а ў яе *аб’ектыўным* спалучэнні з небяспекай, якую стваралі сілы ўнутранай контррэвалюцыі, адцягваючы рэсурсы Савецкай Расіі ад франтоў грамадзянскай вайны, яна стварала пагрозу і для савецкай улады ва ўсёй Расіі. Савецкае кіраўніцтва ўсвядоміла гэта ў выніку абмеркавання катастрафічнай сітуацыі на Усходнім фронце, праведзенага 22 снежня на пасяджэнні Савета абароны Расійскай Рэспублікі пад старшынствам Леніна. Савет абароны, ацаніўшы сітуацыю на Усходнім фронце як небяспечную, рэкамендаваў ураду распарадзіцца “спыніць усякае такое прасоўванне нашых войск на польскай граніцы, на якое палякі будуць мець прэтэнзіі” [34, с. 72].

Выконваючы дырэктыву Савета абароны, ленінскі ўрад на наступны дзень паслаў ясныя сігналы аб сваёй гатоўнасці да кампраміснага міру як на адрас Польшчы, так і на адрас яе заходніх заступнікаў. Пры гэтым у ноце наркама Чычэрына міністру замежных спраў Польшчы было заяўлена, “што ніякая небяспека ёй не пагражае з боку Расіі, і што войскі Расійскай Савецкай Рэспублікі не толькі вельмі аддаленыя ад польскіх граніц, але, акрамя таго, аддзеленыя ад яе Літвой і суседняй часткай Украіны, і ў цяперашні час Расія і Польшча не маюць агульнай граніцы” [35, с. 625] . У гэтым сцвярджэнні была дапушчана – хутчэй за ўсё, у спешцы – адна фактычная неадпаведнасць, якая выяўлялася ў канстатацыі наяўнасці ўкраінска-літоўскай мяжы, якую прызнавала да свайго паражэння Германія, але не прызналі ні дзяржавы–пераможцы, ні Польшча. Рашэнне абвясціць Беларускую Савецкую Рэспубліку, уключаўшую Гродзенскую губерню, удала ўстараняла гэту недакладнасць і ператварала пытанне аб усходняй дзяржаўнай мяжы Польшчы на тэрыторыі былой Расійскай імперыі ў адкрытае для Савецкай Расіі, рабіла яго прадметам патэнцыяльных перагавораў. Не менш важна і тое, што абмен радыётэлеграмамі паміж урадамі РСФСР і Польшчы, пачаты ў канцы 1918 г., дазволіў савецкаму ўраду выявіць абсяг тэрытарыяльных прэтэнзій Польшчы на ўсходніх тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай, задавальненне якіх магло стаць цаной за мір з ёю. У адной з радыётэлеграм польскі бок папракаў Савецкую Расію ў тым, што савецкія войскі “навадняюць Літву і Беларусь, уводзячы тым самым савецкую адміністрацыю ў вобласці, ёй чужыя…”. Частка гэтых тэрыторый аб’яўлялася “бясспрэчна польскімі” [36, с. 30–31].

Ёсць магчымасць звярнуцца і да іншых крыніц, якія сведчаць пра тое, што пасля 22 снежня савецкае кіраўніцтва па ініцыятыве Леніна не толькі зарыентавалася на пошук кампраміснага міру з Польшчай, але і даволі хутка пачало арыентавацца ў мяжы яе патэнцыяльных тэрытарыяльных прэтэнзій. Каштоўнасць гэтых сведчанняў асабліва значная, паколькі паходзяць яны ад асоб, дасведчаных у геапалітычнай і ваеннай сітуацыі ў рэгіёне. Сярод іх – паведамленне члена Рэўваенсавета Заходняга фронту, польскага камуніста

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

С. Бабіньскага начальніку аддзела штаба фронту Дэ Лазары аб змене настрою ў савецкіх кіруючых колах на карысць асцярожнай палітыкі на заходнім стратэгічным напрамку, каб не справакаваць вайну з Польшчай. Ён чуў аб гэтым 25 снежня ў Маскве "ад кіруючых асоб Рэспублікі" [37, л. 101]. Гэта і даклад блізкага да Леніна ў той час балгарскага камуніста Хрысціяна Ракоўскага, былога кіраўніка савецкай дэлегацыі на перагаворах з Украінскай Народнай Рэспублікай, зроблены 24 снежня на надзвычайным агульным сходзе Смаленскай арганізацыі РКП(б). У ім ён ацаніў сітуацыю ў Беларусі як спрыяльную для савецкай улады, але ўказаў на пагрозу з боку Польшчы, якая спрабуе "распаўсюдзіць свой уплыў *на Мінскую губерню і на поўнач ад яе*" [38] (падкр. намі – Р. Л.). Даклад сведчыць аб тым, што яго аўтару была даступная інфармацыя, якой у той час аперыраваў ЦК РКП(б).

Такім чынам, у гэтыя дні, 23–24 снежня, савецкае кіраўніцтва на чале з Леніным зразумела неабходнасць новага "Брэсцкага міру" і новай "перадышкі", на гэты раз у адносінах з Польшчай, і не выключала тэрытарыяльных саступак на яе карысць у якасці цаны за такі мір. Тут нам неабходна зразумець, што праяўляючы ў канцы 1918 г. гатоўнасць да новага "Брэсцкага міру", да міру, звязанага з тэрытарыяльнымі стратамі, савецкае кіраўніцтва на чале з Леніным, нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія перажывала краіна, знаходзілася ў лепшых палітычных і псіхалагічных умовах, чым напярэдадні міру з Германіяй. Гаворкі пра тое, што савецкая ўлада можа ўпасці з дня на дзень, не вялося. А сам Брэсцкі мір ацэньваўся як вялікі поспех маладой савецкай дыпламатыі, паколькі дазволіў занесці рэвалюцыю ў Германію [39, с. 5].

Упэўненасць Леніна і яго паплечнікаў у магчымасці і нават карысці для Савецкай Расіі пры яе слабасці нявыгаднага, на першы погляд, міру з Польшчай выводзілася не толькі са стратэгічных і геапалітычных разлікаў. Улік прасавецкіх і адначасова антыпольскіх настрояў насельніцтва раёнаў Беларусі, вызваленых ад нямецкай акупацыі, быў не менш важным кампанентам гэтай упэўненасці. (Зразумела, гісторыку неабходна ўмець дыферэнцыраваць матывы гэтых настрояў у розных сацыяльных слаёў: для гараджан гэта, хутчэй, былі прарасійскія настроі як выява выбару імі меншага зла, а ў беларускага сялянства яны мелі антыпамешчыцкі і *ў выніку* прасавецкі і антыпольскі характар). З пункта гледжання ленінскага ўрада апошняе было асабліва важна: можна было не баяцца аддаваць пад уладу Польшчы беларускіх сялян. Трапіўшы пад яе ўладу, яны пераўтвараліся ў саюзніка Савецкай Расіі, як гэта было нядаўна пад нямецкай акупацыяй, калі, не чакаючы дырэктыў з Петраграда – Масквы, разгарнулі барацьбу супраць германскіх рабаўнікоў.

24 снежня "Праўда" выйшла з рэдакцыйным артыкулам, у якім упершыню была сфармуляваная ідэя "другой перадышкі". У наступныя дні гэта ідэя неаднойчы акцэнтавалася газетай, у прыватнасці, у артыкулах ужо вядомага нам Х. Ракоўскага.

Такім чынам, фармальнае аддзяленне Беларусі ад Савецкай Расіі ў выглядзе савецкай рэспублікі было неабходнае, каб заахвоціць Польшчу да перагавораў аб новым "Брэсцкім" міры. Неабходна было спачатку аддзяліцца ад яе буфернай тэрыторыяй, што аблягчала дэманстрацыю мірных намераў – маўляў, Чырвоная Расія не мяжуе з Польшчай і не стварае ёй пагрозу. Выдзяленне з гэтай тэрыторыі яе большай ці меншай часткі як сродку абмену на мір, магло б стаць, і, як вядома, сапраўды стала наступным крокам у гэтай палітыцы "перадышкі". Ён быў здзейснены 16 студзеня 1919 г. у выглядзе аддзялення ад БССР трох усходніх губерняў. Тыя, што засталіся ў яе складзе, якраз і былі падрыхтаваны для абмену. Ленін пазней прызнаў, што пытанне аб Беларусі савецкі ўрад збіраўся вырашыць шляхам барацьбы ўнутры Польшчы, што азначала перадачу ёй той часткі беларускай зямлі, на якую Польшча прэтэндавала. Пры гэтым ён зыходзіў з перакanання ў тым, што "польскім памешчыкам і капіталістам чужых зямель не ўтрымаць" [40, с. 139, 320], яны зноў вернуцца да Савецкай Расіі.

Разглядаючы пытанне аб падрыхтоўцы савецкім урадам аб'екта абмену на мір з Польшчай на мяжы 1918–1919 гг., нельга не заўважыць раптоўнага ўздыму ўвагі найболей дасведчаных у гэтай справе органаў савецкага друку да ідэі Літоўска-Беларускай савецкай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэспублікі. Здавалася б на першы погляд, яна павінна была б страціць актуальнасць у святле абвяшчэння ССРБ, але гэтага не адбылося. Больш за тое, орган абкама партыі "Звезда" прэзентавала гэту ідэю ў тым жа нумары за 31 снежня і на той жа старонцы, на якой паведамляла пра абвяшчэнне БССР. Аўтарам артыкула пад загалоўкам "Белорусско-Литовская Трудовая Коммуна» быў не хто іншы, як ледзь не залічаны нядаўна ў апазіцыянеры Ісак Рэйнгольд (тут ён выступіў пад сваім партыйным псеўданімам "І. Рэнёў"). На пачатку Рэйнгольд шчыра патлумачыў прычыну абвяшчэння Беларускай савецкай рэспублікі неабходнасцю парыраваць абвінавачанні Антанты ў адрас Савецкай Расіі ў захопе тэрыторыі, якую пакідае Германія. А затым абгрунтаваў неабходнасць наступнага кроку: стварэння Беларуска-Літоўскай працоўнай камуны. Ён тлумачыў гэтую неабходнасць двума фактарамі: тым, што этнічная Літва маленькая (для дзяржаўнага існавання), і адпаведнасцю гэтага кроку волі беларускага сялянства, выказанай на мінскім з'ездзе. У выніку, пісаў Рэйнгольд, самавызначэнню буржуазіі і памешчыкаў Беларусі і Літвы будзе супрацьпастаўлена самавызначэнне працоўных у выглядзе Беларуска- Літоўскай працоўнай камуны.

Найпрасцей патлумачыць выяўленую "Звездой" літаральна на адной старонцы дваістасць пазіцыі па беларускім пытанні можна было б яе пэўнай разгубленасцю, тым, што яна не паспела зарыентавацца ў новым курсе партыі па гэтым пытанні пасля нарады прадстаўнікоў абкама ў ЦК РКП(б) 27 снежня. Але гэта тлумачэнне будзе няправільным. Вядома, што Мяснікоў, вярнуўшыся з Масквы, правёў два сходы мясцовых камуністаў, інфармуючы іх аб выніках маскоўскай нарады, з якіх адзін быў сходам дэлегатаў партыйнай канферэнцыі перад яе пачаткам. Так што сумнявацца і разважаць не было падстаў, неабходна было выконваць рашэнне ЦК партыі. Відаць, самое рашэнне ЦК было "дваістым", дакладней, двухступенчатым, прадугледжваючы ўжо на гэтым этапе будучае аб'яднанне дзвюх савецкіх рэспублік – літоўскай і беларускай. Гэтую гіпотэзу надзейна падмацоўваюць тагачасныя публікацыі органа Наркамата па справах нацыянальнасцей, якія варта тут працытаваць. У адной з іх член калегіі Наркамнаца Э. Каменскі, прывітаўшы толькі што створаны рабоча-сялянскі ўрад Беларусі, папярэджваў: "Таварышы Беларусіі (так – Р. Л.) павінны памятаць, што іх барацьба далёка не скончана. Беларуская Рада спелася з Літоўскай Тарыбай, – яны яшчэ будуць спрабаваць задушыць Рабоча-сялянскую ўладу, запрасіўшы для гэтага "саюзнікаў" (дзяржавы Антанты – Р. Л.), і з гэтай мэтай яны ўжо паслалі ў Лондан дэпутацыю".

Толькі праз 70 год, пасля цяжкіх перыпетый, Беларусь выслізнула з аслабеўшых рук паслядоўнікаў Леніна. Замест савецкай рэспублікі на карце свету з'явілася Рэспубліка Беларусь. Гэта была не простая змена назвы. Ставячы перад сабой задачу набыць суверэнны статус, сучасная беларуская дзяржава абавязана была арыентавацца на тую гістарычную мадэль беларускай дзяржаўнасці, з якою быў пачаты гэты працэс, хоць ён па аб'ектыўных прычынах быў спынены. БССР па сваёй сутнасці інструмента расійскай савецкай палітыкі рашыць гэту задачу была няздольная і не ставіла яе. Такім чынам, выпадаючы з савецкай імперыі, БССР пераўтваралася ў дзяржаўную форму, якая натхняецца ідэяй і вопытам БНР. Бальшавіцкія архітэктары савецкіх рэспублік не магі прадбачыць такога выніку сваіх дзеянняў. Затое сучасны гісторык можа выкарыстаць гэты факт як падказку Гісторыі, як неабходнасць з большай увагай і прафесійнай адказнасцю прыгледзіцца да кароткага перыяду існавання на беларускай зямлі Беларускай Народнай Рэспублікі як мадэлі нацыянальнай дзяржавы, стварэнне якой было пачата ў неспрыяльных умовах, па аб'ектыўных прычынах было спынена і адкладзена ў гістарычны запас. Але і БССР не адыйшла ў гісторыю бясследна. Карыстаючыся гэтым інструментам, беларускі народ выканаў шэраг гістарычных задач, з якіх мінімальна неабходныя заключаліся ў тым, каб не дазволіць суседзям забыць аб сваім гістарычным месцы на гэтай зямлі і аб сваім творчым патэнцыяле.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Крыніцы і літаратура**

1. Елісееў, А. Б. Зміцер Жылуновіч: Чырвоны адраджэнец / А. Б. Елісееў. – Мінск : БудМедыяПраект, 2019. – 296 с.

2. Чернякевич, А. Н. БНР. Триумф побеждённых / А. Н. Чернякевич. – Минск : А. Н. Янушкевич, 2018. – 302 с.

3. Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці : да 100–годдзя абвяшчэння : гістарычны нарыс / А. А. Каваленя [і інш]; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 157 с.

4. Лазько, Р. Р. Супрацоўніцтва ленінскага Саўнаркама з беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі напярэдадні Ўсебеларускага з'езда 1917 г. / Р. Р. Лазько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 1. – С. 3–12.

5. Лазько, Р. Р. Самавызначэнне, прыпыненае гвалтам (Да пытання аб разгоне Усебеларускага з'езда 1917 года. Частка 1) / Р. Р. Лазько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 3. – С. 5–12.

6. Лазько, Р. Р. Самавызначэнне, прыпыненае гвалтам (Да пытання аб разгоне Усебеларускага з'езда 1917 года. Частка 2) / Р. Р. Лазько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 4. – С. 3–10.

7. Антонов–Овсеенко, В. А. Записки о Гражданской войне : в 2 т. – М.: Высший военный редакционный совет, 1924. – Т. 1. – 271 с.

8. Октябрьская революция и армия. 25 октября 1917 – март 1918 г. – М.: Наука, 1973. – 456 с.

9. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: документы и материалы : в 2 т. – Мн. : Госиздат БССР, 1957. – Т. 2. – 1070 с.

10. Белорусская земля. – 1918. – 1 марта.

11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1440. – Воп. 3. – Спр. 433.

12. 1 января 1919 года: Временное рабоче–крестьянское советское правительство Белоруссии : док. и материалы / сост. В. Д. Селеменев (рук.) [ и др.]; науч. ред. М. Ф. Шумейко. – Мн. : Лимариус, 2005. – 266 с.

13. Сталин, И. В. Сочинения : в 18 т. / В. И. Сталин. – М. : Госполитиздат, 1947. – Т. 4. – 420 с.

14. Рудовіч, С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – 200 с.

15. Лазько, Р. 1914–1917: аптымістычная трагедыя Беларусі / Р. Лазько / Białoruskie zeszVtV historVczne. – BiałVstok, 2015. – № 44. – S. 153–168.

16. Советская правда. – 1917 г. – 9 декабря.

17. "Протокол… Первой конференции белорусских секций Российской коммунистической партии (большевиков) в г. Москве" // Славяноведение. – 2008. – № 4. – С. 54–81

18. НАРБ. – Фонд. 4. – Воп. 1.– Спр. 8.

19. Государственный архив Российской Федерации. – Ф. 1235. – Оп. 2. – Д. 4.

20. Малашко, А. М. Белорусские секции РКП(б) / А. М. Малашко // Путем борьбы и труда: По материалам научной конференции, посвященной 70–летию образования БССР и Компартии Белоруссии / [Редкол.: Р. П. Платонов (рук.) и др. – Мн.: Беларусь, 1989. – 237, [2] с.

21. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг). / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мн.: БДУ, 2003. – 307 с.

22. Российский государственный архив социально-политической истории (РГАСПИ). – Ф. 17. – Оп. 4. – Д. 6.

23. Переписка Секретариата. ЦК РКП(б) с местными партийными организациями. Январь – март 1919 г. – М.: Изд–во политич. литературы, 1971. – 554 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

24. НАРБ. – Фонд. 59 п. – Воп.1. – Спр. 41.
25. ГАРФ. – Фонд. 1235. – Воп. 93. – Спр. 311.
26. Жылуновіч, З. Беларускія секцыі РКП і стварэнне БССР / З. Жылуновіч // Полымя. – 1928. – № 10. – С. 12–26.
27. НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 1. – Спр. 8.
28. НАРБ. – Ф. 60 п. – Воп. 3. – Спр. 498.
29. НАРБ. – Ф.15. – Воп. 28. – Спр.10.
30. Дубоўка, У. Сустрэчы / У. Дубоўка // Успаміны пра Цішку Гартнага : зб. / Склад. Жылуновіч Г. Д., Александровіс С. Х. – Мінск: Маст. літаратура, 1984. – 173 с.
31. Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах полит. партий / В. К. Коршук [и др.]. – Мн.: БГУ, 1999. – 289 с.
32. Пратакол I з’езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Падрыхтаваў да друку Ю. Майзель. Пад рэд. С. Агурскага і М. Леўкова. – Менск : Парт. выд., 1934. – 78 с.
33. Игнатенко, И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И. М. Игнатенко. – Мн.: Наука и техника, 1992. – 254 с.
34. У дакуменце – “на которое поляки будут претендовать”: Ленинский сборник. XXXIV. – М.: ОГИЗ, 1942. – 564 с.
35. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М.: Госполитиздат, 1957. – Т. 1. – 824 с.
36. Красная книга. Сборник дипломатических документов об отношениях России и Польши с 1918 до 1920 г. – М.: Госиздат, 1920. – 110 с.
37. Российский государственный военный архив. – Ф. 33988. – Оп. 1. – Д. 66.
38. Западная Коммуна. – 1918. № 303. – 27 декабря.
39. Ленин, В. И. Полн. собр. соч. – Т. 38.
40. Ленин, В. И. Полн. собр.. соч. – Т. 41.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ